Практыкаванне № 258

*Выканайце тэставую работу «**Назоўнік**».*

1. Зборныя назоўнікі абазначаюць сукупнасць аднародных або падобных прадметаў як адно цэлае.
   - Правільнае сцверджанне.
   - Няправільнае сцверджанне.
2. Адзначце адушаўлёныя назоўнікі:
   - валет
   - лялька
   - юнацтва
   - народ
   - сват
3. Адзначце назоўнікі мужчынскага роду:
   - парася
   - сабака
   - плакса
   - Сочы
   - поні
4. Вызначце канчаткі назоўнікаў:
   - пасля начлег..
   - дваццатага лістапад..
   - артысты балет..
   - крэсла з бамбук..
   - лыжка цукр..
5. Вызначце правільную форму назоўніка:
   - Па дахаты гаспадар распавёў мне пра свайго папярэдніка на гэтай пасадзе (*Л. Рублеўская*).
   - Ішоў ён не бокам , па вытаптанай сцежцы, але, як кажуць, конскім следам (*Л. Родзевіч*).
   - Як толькі Сяргей перайшоў калгасны двор, у месячным святле перадвясновай ночы ён убачыў на чалавечую фігуру (*Р. Сабаленка*).
   - Мы ўжо, мусіць, праехалі добрую палавіну ...(*З. Прыгодзіч*).
   - Я давязу цябе да работы, гэта якраз мне па (*Б. Сачанка*).
6. Выпішыце з тэксту назоўнік, які мае форму толькі множнага ліку.

   Па зямлі пабеглі шпаркія цені, каноплі каля вады пацямнелі, стракозы зніклі, у паветры затаўкла машкара, аднекуль паявіліся ластаўкі і закружыліся над вадой, якая ўжо збіралася ў хвалі. Яшчэ момант - і ўсё афарбавалася ў халодныя тоны: сонца было ўжо за хмарай (*Паводле М. Ракітнага*).

Адказ:

LIVEWORKSHEETS